2015 год.

Шматко, Я. Зэльва ды Сапегі / Яніна Шматко // Праца. – 2015. - №3. – 23 студзеня. – С.14.

Вялікі канцлер Вялікага Княства Літоўскага Леў Сапега вядомы яшчэ і тым, што сваім Статутам 1588 года даў штуршок росту мястэчак. Пра гэта ішла размова падчас навукова-практычнай канферэнцыі “Роля Сапегаў у жыцці Зэльвенскага краю”, якую ў другі раз ладзілі ў Зэльве падчас Ганненскага кірмашу. На канферэнцыі прысутныя азнаёміліся з дакладамі: дактаранта кафедры новай і навейшай гісторыі Беларусі гістарычнага факультэта БДУ Сяргея Токць, кандыдата гістарычных навук Аляксандра Доўнара, кандыдыта філалагічных навук, дацэнта Генадзя Праневіча, прафесара кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, доктара гістарычных навук, прафесара Святланы Марозавай.

Мазго, Ул. Вандроўка на кірмаш / Уладзімір Мазго // Маладосць. – 2015. - №7. – С.152-159.

У артыкуле Уладзімір Мазго вядзе расповяд аб сваёй малой радзіме - Зэльвенскім раёна. Гістарычныя звесткі суседствуюць з вершамі Уладзіміра Мінавіча. Успамінаюцца постаці Сапегаў ў гісторыі Зэльвы, прывілея на правядзенне штогадовай ярмаркі, калі славуты кірмаш дасягнуў найбольшага росквіту. Чытач атрымае адказы на пытанні аб царкве-крэпасці ў в.Сынкавічы, касцёле Прасвятой Тройцы, Свята-Троіцкай царкве, колькі гадоў Зэльве, якіх людзей і падзеі пабачыла гэта зямля?

Мазго, Ул. Вандроўка на кірмаш: публіцыстычна-паэтычнае падарожжа / Уладзімір Мазго // Праца. – 2015. – 22 жніўня. – С.9.

Колькі гадоў Зэльве?.. А першая летапісная згадка Зэльвы адносіцца да 1258 года, калі князь Даніла Галіцкі ў час паходу на літоўскага князя Міндоўга ўзяў Ваўкавыск і паслаў атрад на чале з сынам Львом на Гародню, а ваяводу Міхайлу – ваяваць «по Зелеве». Пра гэта паведаміў нам Іпацьеўскі летапіс. Ёсць меркаванне, што пачаткам Зэльвы паслужыла гара, якая ўзвышаецца над мясцовасцю на 20–25 метраў, з прыкметамі старажытнага паселішча і рэшткамі валоў. Менавіта на гэтую акалічнасць звяртае нашу ўвагу «Энцыклапедыя археалогіі і нумізматыкі Беларусі». Ішлі гады і вякі. Ад аднаго магната да другога пераходзіла мястэчка. Але найбольшага росквіту дасягнула пры князях Сапегах, якія атрымалі прывілей 20 мая 1720 года ад вялікага князя літоўскага і польскага караля Аўгуста ІІ Моцнага на правядзенне штогадовых кірмашоў. З гэтага часу Зэльва становіцца адным з найбуйнейшых гандлёвых цэнтраў Еўропы. Вось што піша пра гэта «Еўрабюлетэнь» (№ 5/2010): «Раней, калі праводзіўся Ганненскі кірмаш, людзі казалі: зэльвенцы адзінаццаць месяцаў на год сумуюць, а месяц жывуць. Кірмаш доўжыўся з 25 ліпеня да 25 жніўня. У XVIII стагоддзі ён быў другім па памеры кірмашом Старога Свету пасля Лейпцыгскага. На

Ганненскі кірмаш, названы ў гонар святой Ганны, прыязджала да пяці тысяч купцоў, а гандлёвы абарот складаў да мільёна рублёў»... Як бачым, Зэльва ўяўляла ў той час амаль што Лейпцыг у гандлёвых маштабах. Сюды з'язджаліся купцы з Расіі, Украіны, Польшчы, Францыі, Саксоніі, Баварыі, Нідэрландаў, Аўстрыі, Прусіі, Італіі, Даніі, Швецыі і іншых краін Еўропы. Тавары, прывезеныя на зэльвенскі кірмаш, былі самыя разнастайныя. У расійскіх купцоў тут можна было набыць скураныя, жалезныя, медныя, бронзавыя вырабы, фаянсавы і фарфоравы посуд, футра, цукар, чай, цыгарэты, мыла, баваўняныя тканіны. Гандляры з Еўропы прапаноўвалі шаўковае, ільняное палатно, баваўняныя вырабы, швейцарскі сыр, турэцкі тытунь, напоі і бакалейныя тавары.

Як сведчыць кніга «Памяць. Зэльвенскі раён»: «Гандлявалі на Ганненскім кірмашы буйной рагатай жывёлай і коньмі. Іх прыганялі памешчыкі і гандляры Лідскага, Кобрынскага і Брэсц-кага паветаў Гродзенскай губерні, часткова Валынскай і Люблінскай (Каралеўства Польскае) губерняў. Збывалі тут коней і Сапегі, якія мелі свой конны завод, дзе было каля паўтары тысячы галоў англійскай, дацкай і турэцкай парод.

Асноўным прадметам гандлю (54 %) было сукно, якое пастаўлялі са слонім-скай, косаўскай, ружанскай, заблудаў-скай і кнышынскай фабрык. Віленскія, гродзенскія і мінскія купцы забяспечвалі кірмаш цукрам, чаем, цыгарэтамі, тытунем, мылам, слонімскія і віленскія – галантарэяй».

Каб павесяліць народ, падчас кірмашу выступалі акрабаты, жанглёры, фокуснікі, цыгане з дрэсіраванымі мядзведзямі і тэатральныя калектывы. Аматары азартных гульняў мелі магчымасць зацугляць сваю ўдачу ў рулетцы, якую прывезлі ў Зэльву з Парыжа і празвалі «фартунай». Вялікай папулярнасцю сярод наведвальнікаў кірмашу карысталіся таксама шынок пані Валабрынскай і драўляны павільён, празваны «сабачай горкай», дзе пад музыку некалькіх скрыпачоў можна было пры жаданні танчыць ажно да раніцы.
Найбольшага свайго росквіту славуты зэльвенскі кір-маш дасягнуў у канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзяў, калі сюды штогод прывозілася тавараў на суму да трох мільёнаў рублёў асігнацыямі. На працягу амаль 130 гадоў ён быў самым буйным у Вялікім Княстве Лі-тоўскім.

У наш час адбываецца аднаўленне традыцыі вялікага Ганненскага кірмашу, вяртанне яго з мінулых стагоддзяў у сучасную Зэльву.
Кажуць, што Сапегі вельмі цанілі Зэльву і ў сваіх уладаннях называлі яе «Зэльвенскім графствам». У XVIII стагоддзі яны адкрылі тэатр, у якім ігралі прыгонныя беларускія, вольныя французскія і польскія акцёры.
Развіццю Зэльвы спрыяў не толькі Ганненскі кірмаш. Тут праходзіў важны гандлёвы шлях: Мінск–Слонім–Ваўкавыск–Гродна–Беласток. Зальвянка ў той час была суднаходнай і пераўтварала мястэчка ў дзеючы рачны порт. А ў 1886 годзе на чыгунцы Беласток – Баранавічы адкрылася станцыя «Зэльва».

Зальвянка, Зэльва… Якое паходжанне такіх блізкіх па гучанні слоў? На гэты конт існуюць розныя погляды.

Пісьменнік і мовазнаўца Уладзімір Юрэвіч у кнізе «Слова жывое, роднае, гаваркое…» сцвярджае: «Назву цяперашні гарадскі пасёлак атрымаў ад ракі Зэльвеі, якая паступова ператварылася ў Зальвянку. У аснове назвы слова залева – месца паводак у веснавую і летнюю пару, калі вада залівала вялікія прасторы».
Другую версію, выказаную народным пісьменнікам Беларусі Янкам Брылём, нагадаў паэт Юрка Голуб: «Пражыў паўстагоддзя і не ведаў, што Зэльва – ад літоўскай жалёі: зялёная»…

Калі ж уважліва прыгледзецца да Зэльвы, якая спакон вякоў патанае ў зяляніне садоў і паркаў, прыбярэжных лугоў і агародаў, то найбольш прымальнай выглядае другая версія паходжання назвы райцэнтра. Але, мне здаецца, абодва выказаныя вышэй погляды маюць права на існаванне.

Попка, Л. Віраваў у Зэльве Ганненскі кірмаш / Людміла Попка // Праца. – 2015. – 26 жніўня. – С.2.

Зэльвенцы могуць пахваліцца тым, што змаглі адрадзіць правядзенне аднаго з самых значных мерапрыемстваў, якія калісьці ладзілася на нашай зямлі – свята “Ганненскі кірмаш”. Прыняць удзел у ім з’язджаюцца госці з самых розных куткоў Беларусі і нават замежжа.

“Ганненскі кірмаш” – гэта яшчэ і магчымасць прыцягваць шырокую ўвагу да турыстычнага, эканамічнага патэнцыялу нашага рэгіёну. Таму напярэдадні свята адбыўся «круглы стол», прысвечаны пытанням ўстойлівага развіцця Зэльвенскага раёна. А само свята, максімальна набліжанае да даўніх традыцый, прайшло ў Зэльве ў мінулую суботу.

Свята раскінулася на цэнтральных вуліцах пасёлка і праходзіла на некалькіх пляцоўках: гандлёвай, рамеснай, прадпрымальніцкай, сельскагаспадарчай, творчай, мастацкай і г.д. Выстава выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і фотамастацтваў прыцягнула ўвагу не адной сотні наведвальнікаў. Гандляры прапаноўвалі шырокі выбар свежай агародніны і садавіны, мясныя, рыбныя, хлебабулачныя вырабы, традыцыйныя беларускія напоі: квас, медавуху і збіцень. Хутка разыходзіліся прысмакі – каўбасы, мясныя вырабы, духмяныя пірагі зэльвенскага філіяла аблспажыўтаварыства. Каля раённага цэнтра культуры і народнай творчасці праводзілі прэзентацыю сваёй прадукцыі прадпрымальнікі і сельскагаспадарчыя падворкі. Самаму прыдзірліваму наведвальніку тут было з чаго выбраць. Удзельнікі свята мелі магчымасць пракаціцца на брычках, паназіраць за выступленнем прадстаўнікоў конна-спартыўных школ, палюбавацца выстаўленымі ў свабодным выгуле ў паркавай зоне конямі мясцовых сельгасарганізацый. Наваўвядзенне гэтага года – магчымасць купіць або прадаць каня.

Па агульных ацэнках, удзел у мерапрыемстве прыняло больш за 4 тысячы чалавек.

Бебех, Д. На падворках – весялосць / Дзіян Бебех // Праца. – 2015. – 29 жніўня. – С.2.

Кожны год на Ганненскім кірмашы падворкі сельвасетаў і сельскагаспадарчых арганізацый ствараюць вясёлую атмасферу свята, маюць цікавае і адметнае афармленне. Так было і на гэты раз: гаспадары шчыра запрашалі ўсіх жадаючых зайсці да іх на падворак, дэманстравалі традыцыйныя прадметы хатняга абіходу, частавалі беларускімі прысмакамі і забаўлялі народнымі гульнямі, песнямі, танцамі.

Сялянскі быт адлюстроўваўся на рамесным падворку Сынкавіцкага сельсавета і СВК “Сынкавічы”. Тут былі шырока прадстаўлены самаробныя іконы, ткацкія вырабы, керамічны посуд. Майстры-ўмельцы праводзілі для жадаючых майстар-класы.

Весялосць і адкрытасць “цыганскага этнасу” перадавалі падворкі Дзярэчынскага і Галынкаўскага сельсаветаў і СВК “Галынка”. Работнікі ўстаноў культуры вельмі добра пераўвасобіліся ў цыганоў, а рамансы і песні ў іх выкананні выклікалі бурныя апладысменты ўсіх гасцей. Зэльвенскі сельсавет і СВК “Бародзічы” арганізавалі тэатральны падворак. Гасцей запрашалі стаць гледачамі інсцэніровак “Паўлінка”, “Мікітаў лапаць”, “Збянтэжаны Саўка”. Дарэчы, апошнія прадстаўленні мелі інтэрактыўны характар: паўдзельнічаць у міні-спектаклях маглі ўсе жадаючыя.
Не сціхала музыка на музычна-інструментальным падворку Каралінскага сельсавета і СВК “Караліно”. Маладыя “яўрэйкі” сустракалі гасцей свята песнямі і танцамі. Музычныя інструменты: бубны, скрыпкі, балалайкі, шалестуны гучалі на ўсю моц.

Звонкі дзіцячы смех даносіўся з падворка “Дабро сельскае”. Сельскагаспадарчы філіял “Дабрасялецкі” і сельсавет арганізавалі зону адпачынку для дзетак, дзе яны маглі праявіць сябе ў традыцыйных беларускіх гульнях. Ад жадаючых загнаць цвічок у калодачку, занесці чыгун у печ не было адбою. На ўсіх падворках гаспадары праяўлялі гасціннасць, частавалі гасцей малаком, варанай бульбай, печанымі яйкамі, духмянымі дранікамі, садавінай і ягадамі.

“На танцулькі да Паўлінкі” запрашаў на Ганненскім кірмашы Тулаўскі сельскі савет і СВК “Міжэрычы”. Гасцей сустракаў сімвал падворка – паўлін, зроблены з жыта. Гаспадары вучылі ўсіх прысутных танцам: лявонісе, кракавяку, польцы.

Па ўсей вуліцы разносіўся пах смажанай бульбы: гэта на падворку “Нацыянальнай кухні” Крамяніцкага сельсавета і філіяла “Князева”

частавалі дранікамі, бульбай са шкваркай і квасам, зробленым па старадаўнім рэцэпце. Таму тут былі асабліва шматлюдна. Накармілі ўсіх!

Бебех, Д. Хобі перарасло ў прафесію / Дзіяна Бебех // Праца. – 2015. – 22 жніўня. – С.4.

Пастаяннымі ўд зельнікамі Ганненскага кірмашу, шматлікіх раённых свят, выстаў, конкурсаў з'яўляюцца работнікі Дзярэчынскага дома рамёстваў. Установа функцыянуе пяты год і аб'ядноўвае ў сваім калектыве таленавітых майстроў, якія працуюць па асноўных напрамках народнай творчасці: саломапляценні, кераміцы, разьбе па дрэве, вышыўцы, ткацтве і многіх іншых. Па словах дырэктара ўстановы Алы Сідорык, іх дзейнасць накіравана на падтрымку традыцыйнага народнага мастацтва, развіццё творчых здольнасцей дзяцей і дарослых, далучэнне да беларускай культуры і народнай творчасці, арганізацыю пераемнасці традыцый. Як могуць пераканацца прысутныя на кірмашы, майстар-класы, якія даюць педагогі ўстановы, заўсёды карыстаюцца ў зэльвенцаў вялікай папулярнасцю. Так, узяць урок па разьбе па дрэве можна ў Міхаіла Грынцэвіча, кіраўніка гуртка "Драўляныя таямніцы" Дома рамёстваў.

Разьбой Міхаіл займаецца больш за 20 гадоў: спачатку гэта было хобі, якое пазней стала прафесіяй.Сярод работ майстра як невялічкія сувеніры, шыльды, маленькія шкатулачкі, так і мэбля, а таксама велічныя скульптуры. Адна з іх – "Змяіны цар" – упрыгожве цэнтральны сквер у Зэльве і была створана падчас пленэра рэзчыкаў у 2013 годзе.

Ковалевич, Т. От славных предков – к устойчивому развитию / Тереза Ковалевич // Праца. – 2015. – 9 верасня. – С.5.

В последние годы Анненская ярмарка стала своеобразной площадкой для выдвижения и обсуждения различных местных инициатив по устойчивому развитию нашего региона. Не секрет, что любое дело надо начинать с оценки имеющегося потенциала. Правильно рассчитав свои силы, легче идти к поставленной цели. Но всегда ли их достаточно, чтобы воплотить в жизнь ту или иную идею, особенно если она касается устойчивого развития сельской местности? Какую стратегию выбрать, чтобы все-таки достичь желаемого? Вместе с представителями районной власти, общественных объединений, хозяев агроусадеб и других инициативных жителей района эти вопросы за «круглым столом» обсудили научные сотрудники из областного центра и столицы. Свое видение на проблему устойчивого развития Зельвенщины также высказали координаторы Программы Поддержки Беларуси Федерального правительства Германии и проекта Европейского Союза и Программы устойчивого развития ООН.

Использовать потенциал предков.

Устойчивое развитие любого региона невозможно без укрепления связи

поколений. Такую мысль высказал доцент Гродненского государственного университета им.Я.Купалы Сергей Токть, который продолжительное время занимался изучением социально-демографического развития Зельвы прошлых столетий.

Ученый пришел к выводу, что наши предки имели хороший потенциал. Если в 1616 году в местечке насчитывалось лишь 103 двора, то чуть меньше чем за два десятилетия их стало уже 125. Большинство зельвенцев занималось ремесленной деятельностью.

В конце XVIII в. в Зельве было 111 дворов. 32% местных жителей составляли дети в возрасте до 15 лет. Только немногим больше 6% населения было старше 60 лет. Самую многочисленную возрастную группу составляли 30–34-летние жители. Зельва постепенно разрасталась – появлялись здания, связанные с деятельностью кирмаша. Коренное население – строители, гончары и ремесленники.

В XIX в. увеличилось еврейское население, проживающее в Зельве. Здесь насчитывалось 116 еврейских дворов. В то время, когда, согласно переписи 1816 года, было только 40 домов местного населения. Можно предположить, что такое сокращение местного населения вызвано событиями войны 1812 года. В 1862 г.

78 земельных участков принадлежало крестьянам, 8 семей занимались огородничеством.
В гродненском архиве сохранился список семей еврейского населения, датированный 1889 годом. В соответствии с ним, в Зельве насчитывалось 432 семьи и 3282 жителя-еврея. Семьи были большими, по 7–8 человек. Еврейское население в основном жило в центре местечка. Это были мобильные и образованные люди, которым, в большинстве своем, принадлежали торговые и промышленные предприятия. Большое значение в развитии местечка имела Анненская ярмарка, торговый потенциал которой позволял считать Зельву одним из крупнейших торговых центров Гродненской губернии.

Новый проект – новые возможности.

В наше время Анненская ярмарка стала своеобразным брэндом.

Если раньше ключевой целью ее празднования было возрождение культурных и исторических традиций, то в последние годы акцент делается на экономический аспект. Для дальнейшего устойчивого развития Зельвенщины необходимы новые эффективные инициативы. Тему территориально-ориентированного развития Зельвенского района затронул Сергей Салей, координатор проекта Европейского Союза и Программы устойчивого развития ООН «Содействие развитию на местном уровне в Республике Беларусь». В свое время при поддержке ПРООН разрабатывалась стратегия зеленого маршрута «Зэльвенскі дыярыуш»,

возраждалась Анненская ярмарка, финансировались мини-проекты фермерского хозяйства «Верес».

В прошлом году дан старт новому проекту ПРООН за счет средств Европейской комиссии «Содействие на местном уровне в Республике Беларусь».
Участие в нем, по словам Сергея Салея, даст возможность разработки местных стратегий устойчивого развития с учетом существующих потребностей сельских районов, на основании которых уже будут определены приоритеты развития того или иного региона на перспективу.
–Важно, чтобы местные сообщества были готовы сотрудничать с местной властью по вопросу устойчивого развития, – констатировал координатор проекта. – Именно таким инициативам и будет отдан приоритет. Наш район активно включился в конкурс местных инициатив, на который направлено 20 заявок.

Кстати, у зельвенцев уже есть опыт участия в проектной деятельности. О реализации мини-проектов рассказали директор санаторной школы-интерната Жанна Слиж и председатель районной организации «Белорусское общество Красного Креста» Наталья Глушеня.

Санаторная школа-интернат с 2010 года участвует в проекте ЕС/ПРООН "Устойчивое развитие на местном уровне". В результате открыто и успешно функционирует школьное эколого-экскурсионное агентство. На территории школы создан свой зеленый маршрут: 4 гектара занимает сад, 2 гектара – луг. На участке в 1 гектар выращиваются экологически чистые овощи. Для проведения экскурсий по зеленому маршруту готовятся экскурсоводы из числа учащихся. Положительный эффект от реализации данной инициативы подтверждается тем, что в результате деятельности школьного агентства ведется активная работа по преобразованию пришкольной территории, а прибыль, полученная в ходе осуществления проекта, вкладывается в дальнейшее развитие материальной базы учреждения. Инициативы, реализуемые районной организацией БОКК, вносят вклад в развитие социальной сферы района. Проект «Местные волонтерские инициативы гражданского населения в малых и отдаленных районах Беларуси» преследует цель развития молодежного волонтерского движения в районе, направленного на оказание помощи в социальной адаптации и интеграции молодых людей с ограничениями. Волонтеры РО БОКК и молодые инвалиды участвуют в совместных культурных, досуговых, спортивных и благотворительных мероприятиях, акциях Красного Креста. Проект «К долголетию через движение» направлен на расширение возможностей пожилых людей принимать участие в жизни общества. В результате его реализации в парковой зоне поселка обустроена дорожка к больнице, площадка со скамейкой для отдыха. Участие в проекте позволило пожилым людям почувствовать свою значимость и востребованность.

Экономический аспект устойчивого развития.

Консультант Программы Поддержки Беларуси Федерального правительства Германии Франц Мамуль убежден, что экономическое развитие сельских территорий без агротуризма невозможно. По его мнению, примерно 80% потенциала устойчивого развития малых городов может базироваться на въездном туризме. Но туризм – не единственный потенциал. Он может быть лишь базой для успешной реализации местной инициативы. Что касается Зельвенщины, то инициатива поиска соответствующего направления устойчивого развития региона исходит со стороны местной власти, которая занимает в данном во-просе активную позицию. Анненская ярмарка, содействующая разивитию культурно-исторического потенциала района, – яркий тому пример.

Тему развития сельских территорий Беларуси продолжил международный эксперт по устойчивому развитию Олег Сивограков. Для этого можно достаточно успешно использовать потенциал возраждаемых фестивалей, фэстов и кирмашей. От эксперта последовало креативное предложение сделать местные кирмаши и фестивали, подобные Анненской ярмарке, свободными экономическими зонами. Чтобы торгующие на них люди были освобождены от налогов и других контрольных воздействий. Что касается непосредственно ярмарки в Зельве, Олег Владимирович обратил внимание на то, что дальнейшая успешность реализации данной инициативы будет зависеть от сотрудничества местной власти, бизнеса и жителей района.

Подводя итоги заседания, модераторы "круглого стола" пришли к общему мнению, что Зельвенщина имеет хороший потенциал для устойчивого развития. А открытие Центра поддержки устойчивого развития зельвенского края будет содействовать укреплению партнерства между властью, бизнесом, некоммерческими организациями и жителями района по решению местных задач, а также поддержке инициатив в социальной, экономической, аграрной, коммунальной, экотуристической, образовательной и других сферах в рамках стратегии устойчивого развития региона.

Попка, Л. Кірмаш віраваў / Людміла Попка; фота аўтара // ЛіМ. – 2015. – 11 верасня. – С.15.

Зэльвенцы могуць ганарыцца тым, што здолелі адрадзіць адно з самых значных свят, якое ладзілася калісьці на гэтай зямлі, – "Ганненскі кірмаш". На фэст з'язджаюцца госці з самых розных куткоў Беларусі і замежжа. "Ганненскі кірмаш", у якім сёлета ўдзельнічала больш як 4 тысячы чалавек, – гэта яшчэ і магчымасць прыцягнуць увагу да турыстычнага і эканамічнага патэнцыялу рэгіёна. Таму напярэдадні свята, адбыўся "круглы стол", прысвечаны пытанням устойлівага развіцця Зэльвенскага раёна. А сам кірмаш, максімальна набліжаны да даўніх традыцый, распачаўся з тэатралізаванага прадстаўлення і праходзіў на некалькіх пляцоўках: гандлёвай, рамесніцкай, прадпрымальніцкай, сельскагаспадарчай, творчай,

мастацкай…
Выстаўка-продаж выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і фотамастацтва прыцягнула ўвагу не адной сотні наведвальнікаў. Нават самаму прыдзірліваму пакупніку было што выбраць! На рамесніцкай пляцоўцы – кашы і шкатулкі, талісманы і абярэгі, выцінанкі і сурвэткі, каралі і завушніцы, адмысловы посуд.

Члены журы вызначылі лепшыя пляцоўкі прадстаўнікоў малога і сярэднага бізнесу, падворкі сельгасарганізацый і сельсаветаў. Адбыліся конкурсы на самы арыгінальны касцюм, лепшы каравай, афармленне павозак і балконаў. У другой палове дня “князь Сапега” назваў імёны пераможцаў у кожнай намінацыі і ўручыў пераможцам памятныя падарункі.

Шумович, А. Иду на праздник… на тренировку: каратэ / Алеся Шумович // Праца. – 2015. – 16 верасня. – С.5.

Впервые в Зельве на Анненской ярмарке команды условных Востока и Запада боролись за победу в каратэ.

Немало зрителей во время Анненской ярмарки собрала на центральной площади поселка первая международная матчевая встреча по каратэ. Участие в соревновательном противостоянии «Восток-Запад» приняли спортсмены из России, Беларуси и Латвии.

После небольшого показательного выступления команды условных Востока и Запада начали поединки. Пять раундов, пять непримиримых противников и всего полторы минуты, чтобы пробить броню (читай - защиту) противника. В первом поединке сошлись латыш Денис Куреннова и зельвенец Андрей Жилич. Ребята работали технически, поэтому стоимость долго оставался «сухим», пока, наконец, Андрей не нанес мощный удар, который подарил первую победу белорусского сборной. Обойти по вазари (очки в каратэ) соперницу удалось и Анастасии Матюк. Титулованная спортсменка не бросалась в атаку, зато эффективно «встречала» гостю. 3: 0 - таков результат второй встречи. Следующая пара - Александр Миронов (Волковыск) и Денис Жуков (Москва). Два очка в пользу Саши - и в копилку белорусов отправилась третья победа. Против минчанки Дарьи Березинскому противники выставили латышка Сабина Терехову. Напряженный поединок решился в пользу Сабины. По итогам этой встречи (счет 2: 0) сборной Восточной Европы начислено одно очко за победу. Пятый поединок, где сражались Денис Кудлис (Латвия) и Илья Бабаев (Беларусь), завершился вничью. В результате по итогам матчевой встречи победили хозяева турнира.
Примечательно, что уровень технической подготовки спортсменов из-за границы был очень высоким, что в очередной раз доказало – в каратэ побеждает не сильнейший, а умнейший. Только обдуманная тактика ведения поединка может принести победу. А чтобы зрители матчевой встречи эту тактику могли осознавать, арбитр-инспектор соревнований,

главный тренер сборной Республики Беларусь по шотокан каратэ-до Андрей Вилькин комментировал происходящее.

По громким аплодисментам и крикам «Беларусь дава-а-а-а-й!» Стало понятно: зельвенцам понравилось то, что они увидели. И хотя хлеба организаторы турнира, в отличие от ярмарочных мастериц-рукодельниц, не предлагали, зрелищ хватило сполна. Кстати, сам праздник иностранцы сочли не менее зрелищным. Об этом свидетельствовали записи в книге отзывов об Анненской ярмарке.

Мацюк, А. Местачковыя асілкі / Наталля Мацюк // Праца. – 2015. – 16 верасня. – С.5.

Здаўна ні адзін кірмаш не абыходзіўся без спартыўных баталій. Сёлета цэнтральная плошча на некаторы час ператварылася ў арэну, на якой мерыліся ў сілах местачковыя асілкі.

Шмат прыхільнікаў здаровага ладу жыцця сабрала сустрэча аматараў сумо. За званне лідара змагаліся зэльвенскія спартсмены і адзін прадстаўнік суседняй Латвіі.

На якія толькі хітрасці не давялося ісці адзінаборцам, каб адолець сапернікаў. Выбраўшы ўласную методыку, кандыдаты ў чэмпіёны імкнуліся падпарадкаваць сабе фартуну.

Асаблівую дынаміку набывала спаборніцтва, калі на татамі выходзілі спартсмены розных вагавых катэгорый. Прычым вынікі такіх сустрэч часцей за ўсё быў даволі нечаканым.

Абсалютным параможцам турніру стаў Іван Мацюк. Другое месца дасталося Аляксею Галанькову. На трэцяй прыступцы апынуўся Віталій Кароль. Лепшых з лепшых, безумоўна, чакалі заслужаныя ўзнагароды.

Мацюк, А. Кірмашовы настрой / Наталля Мацюк // Праца. – 2015. – 23 верасня. – С.5.

Сярод педагагічнага калектыву санаторнай школы-інтэрната шмат таленавітых асоб. Яны заяўляюць пра сябе і на мерапрыемствах, якія тут ладзяцца, і ў разнастайных конкурсах удзельнічаюць. Не выключэнне і славуты Ганненскі кірмаш.

Работнікі навучальнай установы актыўна ўключыліся ў касцюміраванае шэсце. У бягуым годзе яны выступілі ў ролі гандляроў з Вільні, якія прапаноўвалі на продаж тканіну.

Вядома, што некалькі стагоддзяў назад мястэчка Зэльва слыло на ўсю Еўропу дзякуючы кірмашу, які працягваўся ажно цэлы месяц.Сюды

з'яджаліся купцы з краін замежжа, каб рэалізаваць сваю прадукцыю. У тым, што прадстаўнікоў школы паспяхова пройдуць таргі,сумненняў не ўзнікала: строі педагогаў пацвярджалі якасць тавару. Такі крэактыўны падыход настаўнікаў да конкурсу адзначаны каштоўным падарункам. Скарбонку ўзнагарод папоўніла другое месца за лепшы фотарэпартаж. На працягу свята карэспандэнты школы шукалі цікавыя кірмашовыя сюжэты, якія і паслужылі асновай для падрыхтоўкі матэрыялаў.

Шырокае поле для творчасці было прадстаўлена стваральнікам касцюма са старонак раённай газеты "Праца". На славу пастараліся выхавальнікі ўстановы Людміла Азерская і Святлана Баравік. Некалькі гадзін працы, майстэрства рук – і на суд журы паўстаў строй тагачаснай модніцы. Шляпу, выробленую з пераплеценых палос, аздобілі стужкай, якая прыгожа спалучылася з папяровым бантам. Дапаўнялі вобраз жаночая сумка і веер у спалучэнні з ільняной кашуляй. Вынаходніцтва педагогаў заслужыла перамогу у конкурсе.

Шумович, А. Приметы добрых перемен / Алеся Шумович // Праца. – 2015. – 23 верасня. – С.3.

И заговорило дерево…

На протяжении 2013 года жители и гости райцентра наблюдали за тем, как в поселке одна за другой появлялись деревянные скульптуры. Два пленэра резчиков по дереву прошли на Зельвенщине по инициативе председателя районного исполнительного комитета Яна Пальчиса.

Темой первого стали легенды и предания Зельвенщины. Перед участниками стояла задача познакомиться с местными мифами и поверьями, продумать образы и воплотить их в липовом бревне. Корочки народных мастеров оказались не «липовыми» – через неделю в центральном сквере поселилась сказочная братия. 6 скульптур оживили вид самого посещаемого места Зельвы.
После второго пленэра, проходившего в рамках Анненской ярмарки и посвященного истории этого давнего праздника, зельвенскую площадь и территорию у магазина «Виктория» украсили еще 10 статуй. Сегодня деревянные скульптуры наравне с удивительным костелом, шикарным водохранилищем – визитная карточка Зельвы. Нередко у поделок размера XXXL можно увидеть фотографирующихся людей. Так зельвенцы и гости района доказывают свое уважение к культурному наследию Беларуси, родного края.

За самобытностью – в «Ганненскі падворак».

Важным событием 2013 года для кооператоров и жителей поселка стало открытие после реконструкции кафе по улице 17 Сентября.

Вместо прежнего названия «Молодёжное» оно получило новое – «Ганненскі падворак».

Имя символичное, учитывая, что открытие заведения состоялось во время празднования Анненской ярмарки. Колорит и внутреннее убранство кафе полностью соответствуют стилистике мероприятия. Необычный интерьер обеденного зала, мебель, изготовленная по мотивам старинной корчмы, напоминают о празднике многовековой давности. Этой же цели служит настенное декоративное панно.

– На реконструкцию заведения было затрачено более 500 миллионов рублей, – отмечает директор Зельвенского филиала Гродненского облпотребобщества Таиса Желковская. – Постарались изменить не только внешний вид кафе, но и качество услуг.

Благодаря этому за два года «Ганненскі падворак» стал популярным местом отдыха зельвенцев. Зал рассчитан на 41 посадочное место, что позволяет проводить здесь различные празднества: свадьбы, юбилеи, дни рождения. Люди с удовольствием приходят сюда за хорошим настроением.
– Отличное место, – делится впечатлениями о кафе посетитель Дмитрий. – Очень нравится здешняя обстановка – старинный быт сейчас в моде, как и национальная кухня. Приятно, что в меню ей посвящен целый раздел. Не один раз бывал здесь и буду посещать это кафе впредь.

Шматко, Я. Пра Ганненскі кірмаш і не толькі: прэзентацыя кнігі / Яніна Шматко // Праца. – 2015. – 28 кастрычніка. – С.2.

Краязнаўчыя фонды зэльвенскіх бібліятэк папоўніліся вельмі цікавым выданнем: зборнікам артыкулаў “Ганненскі кірмаш. Мінулае, сучаснае, будучае”. Выйшаў зборнік у Слонімскай друкарні. Над складаннем кнігі працаваў аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама, прадмову да зборніка напісала намеснік дырэктара раённай бібліятэкі Марына Кніга. Прэзентацыя выдання адбылася ў бібліятэцы напярэдадні Ганненскага кірмашу.

Вядучыя імпрэзы – загадчыца аддзела абслугоўвання і інфармацыі Валянціна Масюк і ўжо згаданая Марына Кніга – звярнулі ўвагу прысутных на тое, што з дзесяці навуковых работ, якія ўвайшлі ў зборнік, чатыры прысвечаны Ганненскаму кірмашу, яшчэ шэсць – знакамітаму роду Сапегаў, пры якіх кірмаш у Зэльве набыў найвялікшы размах.

Кандыдат гістарычных навук Андрэй Кіштымаў у сваім даследаванні прасачыў развіццё кірмашоў у Беларусі з моманту іх з’яўлення ў канцы XV ст. Андрэй Леанідавіч лічыць, што вопыт пяці вякоў вельмі патрэбен сённяшнім прадпрымальнікам, бо ён дазваляе выявіць тыя элементы эканамічнай культуры, якія не толькі працягваюць традыцыі, але і дапамагаюць арганічнаму пранікненню аднаго ў другое старога і новага.

Шмат крыніц выкарыстаў для падрыхтоўкі змястоўнага артыкула “Зельвенская ярмарка” краязнаўца з Ваўкавыска Мікалай Быхаўцаў. Вядучыя прэзентацыі прыводзілі некаторыя цікавыя звесткі. Так (у гэта складана паверыць, але факт неаспрэчны), у невялікіх мястэчках не было паліцыі. Таму на час правядзення Ганненскага кірмашу стваралася часовая паліцыя пад старшынствам мясцовага земскага спраўніка.

Аспіранты Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы Л.Ф. Рогач і Т.С. Вайцешык даследавалі “Заканадаўча-прававое афармленне дзейнасці корчмаў і шынкоў на беларускіх землях у XVI–XVIII стст.” і “Гандаль мястэчак Ваўкавыскага павета (1921–1939 г.г.)”. З іх работ можна даведацца, колькі і якіх корчмаў было ў беларускіх мястэчках (у тым ліку і ў Зэльве), якія тыпы падаткаў прымяняліся да ўладальнікаў корчмаў і шынкоў, у якія дні тыдня адбываліся ва ўсіх мястэчках звычайныя кірмашы і г.д. Напрыклад, у 1927 годзе ў Зэльве працавалі кафейня, гасцініца, 3 рэстараны, тракцір-сталовая і 4 чайных. Або: “Ва ўсіх мястэчках Ваўкавыскага павета таргі збіраліся адзін раз на тыдзень,... а ў Зэльве – двойчы: у аўторак і чацвер”, – прывялі вытрымку з артыкула вядучыя.

Асаблівую цікавасць у прысутных выклікалі матэрыялы, прысвечаныя Сапегам і іх ролі ў жыцці зэльвенцаў. Кандыдат філалагічных навук Генадзь Праневіч у сваёй рабоце “Сапегі ў культуры і гістарычным лёсе Беларусі: радавод” разглядае ўклад роду Сапегаў у культурную сусветную спадчыну. З гонарам за род, які пакінуў пасля сябе значны след і ў гісторыі зэльвенскага краю, даследчык гаворыць: “Паводле генеалагічнай табліцы на 1995 год, складзенай Яўстахам Сапегам, да гэтай “Сям’і” належыць 714 вядомых па імёнах асобаў мужчынскага і жаночага роду, з іх паводле прамой кроўна-генетычнай повязі – 60”. А генеалагічнаму дрэву Сапегаў – без малога 600 гадоў! “Рэдка які радавод існаваў столькі стагоддзяў”, – падкрэслілі вядучыя. Акрамя сусветна вядомага Льва Сапегі, вучоны называе літаратара і мецэната Яна Фрыдэрыка Сапегу, палкаводцаў Паўла і Яна Пятра Сапегаў, асветніка і падарожніка Аляксандра Антоні Сапегу, жанчыну з роду Сапегаў – асветніцу Ганну Паўліну Ябланоўскую і інш.

Навукоўцы Валянцін Голубеў і Аляксандр Доўнар “робяць першую спробу ўвядзення ў шырокае навуковае абарачэнне” часткі матэрыялаў са зборніка дакументаў, што захоўваецца ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта і тычыцца арганізацыі жыцця насельніцтва ва ўладаннях роду Сапегаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Духам асветніцтва прасякнуты дзве інструкцыі, якія аўтары друкуюць у дадатку і аналізуюць іх. Гэта – “Інструкцыя Францішка Сапегі па ўвя-дзенні ў маёнтках Дзярэчын, Зэльва, Ружаны, Высокае сялянскіх судоў” і “Інструкцыя Францішка Сапегі з апісаннем абавязкаў сельскіх дзясятнікаў у маёнтках Дзярэчын, Зэльва, Ружаны, Высокае”.

Уражвае добрае веданне Францішкам Сапегам сялянскай псіхалогіі, якое абвяргае пануючую думку, што арыстакраты “слишком далеки от народа”. У

інструкцыі па вядзенні сялянскіх судоў Сапега, улічваючы недавер да панскага двара, канстатуе правамернасць такога недаверу, бо нярэдка з людзьмі абыходзіліся "горш, чым з хатняй жывёлай (быдлам)". Таму, лічыць Францішак Сапега, і патрэбен справядлівы суд саміх сялян над вінаватымі з іх асяроддзя. А ў інструкцыі па рэгламентацыі абавязкаў сельскіх дзясятнікаў Сапега патрабуе, каб дзясятнік сачыў за маральнымі паводзінамі сваіх падапечных, ведаў як дбайных, так і марнатраўных гаспадароў. Калі селянін гультай або п'яніца і яго сям'і пагражае голад, дзясятнік меў права абмяжоўваць такога гора-гаспадара ў правах. Кожны тыдзень войт з дзясятнікамі павінны былі даваць пану справаздачу аб усім, што дзееццa ў вёсцы (ці ўсе здаровыя, ці няма ў хаце звадак, ці ёсць насенне збожжа на пасеў і г.д.). Старанныя дзясятнікі мелі некаторыя прывілеі. Напрыклад, часткова вызваляліся ад чыншу.

Яшчэ адна дастойная ўвагі зэльвенцаў работа, на якую звярнулі ўвагу вядучыя, – "Рынкавая плошча Зэльвы. Сацыятапаграфічнае развіццё ў часы Сапегаў (канец XVII–першая палова XIX ст.)". Яе падрыхтавалі бацька і сын Токці. Даследчыкі прасачылі развіццё рынкавай плошчы і вуліц Зэльвы за перыяд з 1616 да 1830 гадоў, г. зн. больш як 200 гадоў. Інвентары 1616 і 1631 гг. складзены для Льва Сапегі. У 1616 годзе рынкавы пляц займаў тэрыторыю прыкладна каля 900 квадратных метраў. Вакол плошчы размяшчалася 16 мяшчанскіх сядзіб. Вуліц у мястэчку на той час было толькі тры – Ваўкавыская, Дворная і Мяжэрыцкая. Усе яны пачыналіся ад плошчы. Інвентар 1631 года па-ранейшаму згадвае тры вуліцы, а 1815 г. – ужо восем. Назвы вуліц гавораць самі за сябе. Слонімская вяла праз Зальвянку на Слонім. Ружанская мела брэсцкі накірунак, Касцельная і Царкоўная вялі да храмаў, Дворная – у палац Сапегаў, што размяшчаўся ў раёне сённяшняга мікрараёна "Паўночны" ў Зэльве.

Уладальнікамі пляцаў на плошчы былі продкі сённяшніх Горбачаў, Генюшаў, Жукоў, Казлоўскіх, Крамнікаў, Кузьмічоў, Путрэшаў, Рудых, Русакевічаў, Сакалоўскіх, Язерскіх...

Кніга "Ганненскі кірмаш" – выдатная крыніца інфармацыі для ўсіх, хто хоча падрабязна ведаць, што ўяўляла сабой Зэльва ў даўнія часы, аб яе традыцыях, гісторыі ўзнікнення і развіцця кірмашу, а таксама аб гісторыі вядомага магнацкага роду Сапегаў, іх гісторыка-культурнай спадчыне.

Кречко, К. Анненская ярмарка-2015: анализ, планы на будущее / Клавдия Кречко // Праца. – 2015. – 4 лістапада. – С.1,2.

Чуть более двух месяцев прошло с того времени, как отгремела в Зельве Анненская ярмарка – самый массовый культурный праздник районного масштаба, который стал любимым и почитаемым не только среди местных жителей, но и многочисленных гостей близкого и дальнего зарубежья (по подсчётам сотрудников районного отдела внутренних дел в этом году на нём присутствовало порядка 5 тысяч человек). В памяти ещё хорошо живы

все событийные моменты. Проанализировать их, высказать все «за» и «против» – такую задачу поставил перед членами оргкомитета по подготовке и проведению районного праздника «Анненская ярмарка» во время очередного заседания заместитель председателя райисполкома, председатель оргкомитета Валентин Семеняко.

По мнению собравшихся, видится необходимость более оперативно и широко анонсировать мероприятие, используя для этого различные каналы СМИ и интернет-ресурсы. Чтобы люди заранее знали и несколько активнее готовились к объявленным конкурсам, проектам, выставкам. Достигнутый с годами высокий уровень проведения праздника тем не менее требует совершенствования.
В первую очередь, это касается торговли. Государственной или частной – нет разницы. Приглашать в Зельву нужно субъекты малого и среднего бизнеса из всех уголков страны. Недостаточно местных торговцев. Главным товаром на Анненской ярмарке должны стать, как и когда-то в XVII веке, лошади для хозяйственных или спортивных целей. Начало торговле лошадьми было положено в этом году, и традицию следует продолжить. С каждым годом расширяют свое предназначение подворья. Внимание людей привлекают оригинальное самобытное оформление, презентация, сохранение народных традиций. А почему бы не использовать место на подворье для торговли сельхозпродукцией местного хозяйства или с личного подворья граждан?! Вариантов было предложено множество, и все планируется учесть в будущем.

Всегда оживлённо на празднике на площадке города мастеров. Народные умельцы с удовольствием дают мастер-классы и собирают возле себя немало людей, в основном, молодёжь. Побольше бы таких мастеров! Для этого следует поддерживать дружеские связи с Домами ремёсел других районов и приглашать их на праздники в Зельву. И ещё одно, не менее интересное предложение: организовать эстафету кирмашей. А почему бы и нет – прекрасная возможность себя показать и на других посмотреть. Идей, интересных и креативных, в ходе заседания оргкомитетабыло предложено множество. Все их Валентин Семеняко поручил аккумулировать, проанализировать и попробовать применить. Уважаемые зельвенцы, у каждого из вас также есть хорошая возможность внести своё предложение по развитию Анненской ярмарки. Не оставайтесь безразличными, проявляйте инициативу, звоните, учавствуйте. Контактный телефон 2-45-58.

В тему.

- В празднике “Анненская ярмарка” приняло участие 60 профессиональных исполнителей.
- В разных постановках было задействовано более 500 человек, из них - 440 местных самодеятельных артистов.

- Проведено 11 конкурсов, за участие в которых награждена 34 человека и

23 организации.
- Присутствовало 56 индивидуальных ремесленников и 22 мастера из различных районных Домов ремесел Гродненской области.
- Во время ярмарки работало экскурсионное бюро, районным центром туризма и краеведения детей и молодежи проведено 12 групповых экскурсий, 3 из них –для гостей из Литвы, Латвии и Польши.
- Центром творчества детей и молодежи проводилась беспроигрышная лотерея, осуществлялась продажа сувениров.

- 11 индивидуальных предпринимателей республики представили 20 аттракционов.
- Зельвенским филиалом Гродненского облпотребобщества получены розничный товарооборот на сумму 214 млн. руб.

- РУП бытового обслуживания реализовано продукции собственного производства на сумму 7 млн. руб.

- На проведение Анненской ярмарки-2015 было затрачено всего 182,3млн. руб., из них на оплату творческим коллективом - 85,5 млн. руб.